изменить социальные отношения, не имеющие должного обоснования.

**Литература и источники**

1. Forst, R. First Things First: Redistribution, Recognition and Justification / R. Forst // Axel Honneth : critical essays ; edited by Danielle Petherbridge. – Leiden, Boston : Brill, 2011. – P. 303–319.

# МОЛАДЗЬ І КАШТОЎНАСЦІ ГУМАНІЗМУ Ў КАНТЭКСЦЕ ІНФАРМАЦЫЙНАГА ГРАМАДСТВА

*Э. І. Рудкоўскі*

Моладзь – носьбіт вялікага інтэлектуальнага патэнцыялу і творчай энергіі, новых ініцыятыў і форм жыццядзейнасці.

Маладосць – гэта час, калі чалавек будуе планы на будучыню і імкнецца іх рэалізаваць у розных сферах як грамадскага, так і асабістага быцця. Маладосць – гэта час магчымасцей, перыяд крытычнасці, перманентнага пошуку навізны. Можна смела сцвярджаць, што моладзь вызначае будучыню свету. Сучасная моладзь знаходзіцца ў якасна новай сацыяльнай і інфармацыйнай прасторы. Змяняюцца не толькі тэхналагічныя працэсы ў сферы эканомікі, але і ўвесь уклад жыцця людзей, сістэма каштоўнасных арыентацый, уключаючы тыя, якія накіраваны на рэалізацыю каштоўнасцей гуманізму. Гуманізм – з'ява шматгранная і выяўляецца ў самых розных якасцях чалавека і прынцыпах грамадскага ўладкавання. Перш за ўсё гуманнасць – гэта дзейнасць, асноўным матывам якой з'яўляецца прызнанне чалавека ў якасці вышэйшай каштоўнасці. Гуманная асоба – гэта асоба, якая нават ў складаных умовах захоўвае сваю чалавечнасць, паважлівае стаўленне да годнасці і свабоды іншых. Гуманізм як прынцып прадугледжвае свабоднае развіццё і творчую рэалізацыю патэнцыялу чалавека.

Фарміраванне каштоўнасных арыентацый, уключаючы каштоўнасці гуманізму, у інфармацыйным грамадстве мае свае асаблівасці. Сёння маладыя людзі з'яўляюцца не проста грамадзянамі канкрэтнай краіны, а членамі глабальнай супольнасці.

Існуе праблема адбору і распаўсюджвання правернай, верыфікаванай інфармацыі.

Без належнага сацыяльнага кантролю інфармацыйныя тэхналогіі могуць аказваць разбуральны ўплыў на грамадскія працэсы і асабістае жыццё чалавека. Інфармацыйныя працэсы часта становяцца магутным сродкам маніпулявання свядомасцю маладых людзей, фарміравання кліпавага мыслення. Вось чаму нельга цалкам пагадзіцца з пазіцыяй, што «глабальныя інтэрнэт-рэсурсы не змаглі пераадолець нацыянальныя і рэгіянальныя межы, што ўстаяліся» [1, с. 9]. Можа, цалкам гэты працэс не

завяршыўся, але ён нарастае з вялікай хуткасцю і тоіць у сабе не толькі пазітыўныя наступствы, але і негатыўныя выклікі ў сферы каштоўнасных арыентацый маладога пакалення.

Моладзь так ці інакш карыстаецца сусветнай сеткай, што не можа не аказваць уплыву на працэс яе асобаснага станаўлення. Да важных праблем, якія ўплываюць на працэс сацыялізацыі моладзі, можна аднесці нізкі ўзровень інфармацыйнай культуры, адсутнасць выразнай, упарадкаванай сістэмы ў распаўсюджванні грамадска значнай інфармацыі. Мы часам сутыкаемся з сітуацыяй, калі чалавек, які прафесійна валодае электроннай камунікацыяй, у той жа час праяўляе нясталасць у ацэнцы грамадска-палітычных працэсаў, мае праблемы ў міжасобасных зносінах у рэальным паўсядзённым жыцці. Варта памятаць, што ў параўнанні з традыцыйнымі агентамі сацыялізацыі (сям'я, калектыў, школа), уплыў якіх насіў мэтанакіраваны, у пэўнай меры рэгуляваны характар, Інтэрнэт уносіць у гэты працэс значны элемент стыхійнасці і непрадказальнасці. Ён нясе часта нізкаякасную, дарэмную, часам дэструктыўную інфармацыю, спрыяе фармаванню інтэрнэт-залежнасці, не дае зразумелых, ясных, сацыяльна значных каштоўнасных арыентацый.

Рашэнне гэтых праблем з'яўляецца найважнейшай задачай органаў улады, арганізацый і ўстаноў, якія займаюцца паўсядзённай выхаваўчай працай.

Важную ролю ў працэсе сацыялізацыі асобы адыгрываюць, як вядома, зносіны. Але яны ў інфармацыйным грамадстве перажываюць істотныя змены. Інфармацыйныя тэхналогіі ўзнаўляюць прывязанае да камп'ютэра, гаджэту «пакаленне з апушчанай галавой». Рэальныя зносіны паміж людзьмі замяняюцца зносінамі ў віртуальным свеце. У канчатковым рахунку, гэта выліваецца ў няздольнасць вырашаць рэальныя жыццёвыя праблемы. Віртуальныя зносіны не дазваляюць перадаць усю цеплыню чалавечых пачуццяў, без якіх нельга казаць і аб гуманных адносінах у сапраўдным сэнсе гэтага слова. Дыстанцыя паміж рэальным і віртуальным гуманізмам усё ж такі існуе. Адсутнасць вопыту зносін гукаецца затым у дарослым жыцці. Выходзячы ў рэальны свет, такія маладыя людзі адчуваюць неспакой і замяшанне. Больш за тое, знаходжанне ў віртуальным асяроддзі небяспечна магчымасцю траплення ў пастку чужых духоўных каштоўнасцей, бо спосабы маніпулявання свядомасцю надзвычай вялікія. Адным з вынікаў інтэрнэт-залежнасці з'яўляецца такі феномен, як адзінота. Імкнучыся яго пераадолець, звяртаюцца да сацыяльных сетак. Але тут круг замыкаецца. Следства пачынаюць лячыць прычынай, якая гэта следства і выклікала. У сувязі з гэтым наўрад ці можна занадта аптымістычна ацэньваць уплыў інфармацыйных тэхналогій на духоўны свет чалавека, меркаваць, што «"смарт-грамадства" будзе грамадствам бесперапынных, выведзеных на дысплей адкрыццяў у навуцы і мастацтве, грамадствам маральных людзей» [2].

Моладзь сёння інтэграваная не толькі ў глабальныя інфармацыйныя патокі, але і, як следства гэтага, у глабальнае грамадства спажывання і вытворчасці духоўных каштоўнасцей. Інтэрнэт ператварыўся ў своеасаблівае асяроддзе жыхарства моладзі, выкарыстоўваецца Захадам для нападаў на традыцыйныя каштоўнасці, каштоўнасці гуманізму, якімі кіраваўся соцыум на працягу многіх стагоддзяў. Маладым людзям даносяць, навязваюць устаноўку, што ёсць «небінарныя, трансгендэрныя, транссэксуальныя» людзі. Калі хтосьці не згодны, ён гамафоб або трансфоб. А гэта ў Еўропе прыкмета расізму. «Забараніць забараняць» – вось лозунг. Вычварэнствы і заганы ператварыліся ў норму. Тэрор меншасцей на Захадзе становіцца ўсё больш жорсткім, а т. зв. паліткарэктнасць пераважыла ўсе строгасці цэнзуры. Маральныя табу і забароны абвяшчаюцца дыктатам «патрыярхальных каштоўнасцей». Перад намі магутная сістэма разбурэння прыроды, сутнасці чалавека. Знішчыць чалавека аказваецца лёгка – трэба забараніць яму ўсё, што стала для яго звыклым у жыцці, што складае сутнасць яго быцця. Парадаксальна, што робіцца гэта пад сцягам не проста гуманных, а звышгуманных меркаванняў, меркаванняў згоды ў грамадстве, бо нічога нельга забараняць. Лібералізм і культура адмены перамагаюць. І чым больш ускладняецца свет, тым больш выяўляецца прымітывізацыя яго ў разважаннях заходніх палітыкаў і тэарэтыкаў.

Малады чалавек у значнай меры жыве ў віртуальным свеце. Яму там, мабыць, камфортна. Але важна памятаць, што рана ці позна давядзецца вяртацца ў рэальны свет. Вось чаму павінны існаваць адаптацыйныя механізмы ўрастання маладога чалавека ў гэты свет. А гэта азначае, што моладзь можа стаць актыўным удзельнікам розных формаў жыццядзейнасці толькі пры наяўнасці пэўных аб'ектыўных умоў (узровень матэрыяльнага дабрабыту, удасканаленне палітычнай сістэмы грамадства, рост яго духоўнай культуры) і суб'ектыўных перадумоў, сфармаваных светапоглядных арыентацый. Моладзь не проста фарміруецца ў грамадстве, але і фарміруе яго, фундаментуе сучаснасць і шмат у чым вызначае вобраз будучыні.

**Літаратура і крыніцы**

1. Донских, С. В. Между «Галактикой Интернет» и региональными границами: опыт анализа виртуальных практик современной белорусской молодежи / С. В. Донских // Современная молодежь и общество : сб. научных статей. – Минск : РИВШ, 2021. – Вып. 9. – С. 4–10.

2. Кугай, А. И. Угрозы и надежды «цифрового поколения» в эпоху информационно-цифровой цивилизации / А. И. Кугай [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ruskline.ru/ analitika/ 2019/ 05/ 24/ ugrozy_i _nadezhdy _cifrovogo_pokoleniya_ v_epohu_informacionnocifrovoj_civilizacii. – Дата доступа: 01.09.2023.